**М.А.Бяспалая**, *дацэнт*

# 1920-Я ГАДЫ І ІХ МЕСЦА Ў СТАНДАРТАХ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Згодна з агульнымі патрабаваннямі спецыялісты з культуралагічнай адукацыяй павінны мець высокі ўзровень гуманітарных ведаў, бесперапынна папаўняць іх, умець аналізаваць і вызначаць тэндэнцыі развіцця духоўнай культуры. Безумоўна, патрабаванні досыць высокія, і гэта правільна. Аднак відавочна і тое, што без глыбокіх ведаў у галінах гісторыі, этнаграфіі, літаратуры, сацыяльнай і этнапсіхалогіі дасягнуць пастаўленай мэты немагчыма. А менавіта гэтыя дысцыпліны ўтвараюць аснову культуралагічнай навукі.

Багацейшы матэрыял для тэарэтычных высноў, высвятлення агульных заканамернасцей і канкрэтных асаблівасцей, методыкі і метадалогіі культуралогіі ўяўляе гістарычная навука. Падчас вывучэння гісторыі студэнты маюць магчымасць папоўніць школьныя веды, паглыбіць разуменне такіх асноўных гістарычных катэгорый, якімі карыстаецца і культуралогія, як цывілізацыя, антрапалагічна арыентаваная гісторыя, мікрагісторыя, гісторыя ментальнасцей і інш. На аснове атрыманых ведаў студэнт павінен умець характарызаваць сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і духоўнае развіццё вывучаемых цывілізацый, вылучаць іх найбольш характэрныя рысы. Дзеля гэтага ён павінен перш за ўсё вучыцца аналізаваць фактналагічны матэрыял і першакрыніцы, найбольш важныя падзеі гісторыі, суадносіць іх з сучаснасцю.

У гэтым сэнсе перыяд 1920-х гадоў уяўляе вялікія магчымасці. Па-першае, яму папярэднічалі рэвалюцыйныя падзеі, якія рэзка змянілі накірунак і змест як сацыяльна-эканамічнага, так і культурнага развіцця. Рэвалюцыя пачалася з разбурэння назапашаных пакаленнямі матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, фізічнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вынішчэння духоўнай эліты і культурнай праслойкі. Па-другое, вынікам рэвалюцыйнага перавароту стала рэдкая з'ява: адначасовыя існаванне і развіццё супрацьлеглых працэсаў эканамічнага, культурнага, грамадска-палітычнага жыцця. Менавіта гэтая акалічнасць надае выразную адметнасць дваццатым гадам, што ў сваю чаргу дазваляе вылучыць іх у асобны гістарычны і культуралагічны перыяд. Сучасныя метадалагічныя падыходы даюць магчымасць па-новаму асэнсаваць падзеі і працэсы, якія адбываліся ў тагачасным грамадстве. Да галоўных з іх можна аднесці ажыццяўленне новай эканамічнай палітыкі і зямельнай рэформы, вызначэнне асноўных формаў і зместу культурнай дзейнасці, што ўплывалі на сацыяльна-псіхалагічны стан грамадства.

Ні з пазіцыі аб'ектыўнасці, ні з пазіцыі маралі нельга абысці праблем укаранення эканамічнай палітыкі. Асабліва гэта тычыцца вёскі. Пры выкананні дзяржаўных планаў афіцыйныя органы карысталіся метадамі ціску, сілавых рашэнняў, прыніжэння чалавечай годнасці.

Немагчыма не звяртаць увагі на адносіны сялянства да сацыяльна-эканамічнай палітыкі дзяржавы. Без аналізу гэтай праблемы нельга ўявіць усёй складанасці і шматграннасці вясковага жыцця, у тым ліку сацыяльна-псіхалагічных настрояў сялянства. На наш погляд, ігнараванне на практыцы апошняй акалічнасці ў значнай ступені садзейнічала неэфектыўнасці дзяржаўных мерапрыемстваў. Праўда, кіраўніцтва партыі, дзяржавы пры тэарэтычнай распрацоўцы галоўных накірункаў аграрнай палітыкі звяртала ўвагу на псіхалагічны стан вёскі, да чаго заклікаліся і мясцовыя ўлады. Аднак паміж афіцыйнымі пастановамі і іх ажыццяўленнем пралегла непераадольная дыстанцыя, што досыць пераканаўча даказала гісторыя савецкага грамадства. Таму, як мы лічым, вывучэнне сацыяльна-эканамічнай палітыкі 1920-х гадоў, яе аналіз праз успрыманне сялянства дапамогуць узбагаціць гуманістычны змест культуралагічнай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яшчэ адной цікавай і важнай праблемай з культуралагічнага пункту гледжання з'яўляецца праблема ўзаемаадносін горада і вёскі. Па-першае, у 20-я гады існавалі гэтак званыя "нажніцы" цэн, якія характарызаваліся высокімі цэнамі на прамысловыя тавары і нізкімі — на сельскагаспадарчыя, частым "таварным голадам" на вырабы прамысловасці. Адсюль бралі пачатак упэўненасць у тым, што "рабочыя забяспечаны лепш, чым сяляне", і патрабаванне: "Спаганяць больш падаткаў з пяра, ды з таго, хто піша, са шчыблетаў, а не з лапцяў". Па-другое, горад быў іншаэтнічны ў адносінах да вёскі, таму што толькі 8% беларусаў жылі ў гарадах. Пры аналізе праблемы неабходна ўлічваць той факт, што ў шматнацыянальным горадзе пашыраліся інтэрнацыянальныя формы культуры, а ў вёсцы шырока распаўсюджвалася народная культура.

Вельмі важным для паглыблення культуралагічнай адукацыі можа стаць пытанне ўкаранення новай, савецкай культуры. Асабліва значэнне яно набывае пры вывучэнні культурнай сітуацыі ў беларускай вёсцы. Як вядома, сялянства з'яўлялася і заставалася ядром беларускага этнасу, якое забяспечвала захаванне і далейшае развіццё традыцыйнай народнай культуры, маральных і этнічных нормаў. Духоўнае ж багацце народа склала аснову нацыянальнай культуры, а таленавітая сялянская моладзь — падмурак нацыянальнай інтэлігенцыі.

Безумоўна, у шматлікіх падручніках па гісторыі Беларусі разглядаецца працэс фарміравання нацыянальнай культуры. Аднак пры вывучэнні гэтага пытання трэба звярнуць увагу на яго незавершанасць, на слабае пашырэнне нацыянальнай культуры ў вёсцы. Апошняя працягвала карыстацца звыклымі ўяўленнямі аб навакольным асяроддзі, нормамі паводзін, рэлігійнымі вераваннямі, што вызначалі светапогляд яе жыхароў, іх духоўныя памкненні.

У сувязі са сказаным вышэй можам адзначыць, што ў 20-я гады ў культурным жыцці беларускай вёскі адначасова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

існавалі тры плыні: афіцыйна-палітычная, нацыянальна-дэмакратычная і традыцыйна-народная. Калі другая з іх была цесна звязана і вынікала з трэцяй, то першая, прызнаючы другую, спрабавала накіраваць яе ў рэчышча "пралетарскай па змесце і нацыянальнай па форме". Што да народнай культуры, то духоўныя традыцыі сялянства, якія мелі шматвяковыя карані, самабытныя маральныя, этнічныя правілы і нормы, — усё, што надае народу адметнасць, разглядаліся як другарадныя ў ідэалагічным плане. Некаторыя праявы традыцыйнай культуры атрымлівалі проста знішчальныя характарыстыкі, асабліва ў камсамольскай моладзі. Напрыклад, свята Купалля вызначалася як "нацыяналістычны шабаш контррэвалюцыі", а Каляд — як "свята буржуазна-кулацкай контррэвалюцыі".

Адной з першапачатковых задач савецкай улады ў галіне культуры стала як мага шырэйшае распаўсюджанне новай культуры, дзеля таго каб хутчэй далучыць да яе насельніцтва,ператварыць яго ў культурнае ў той меры, у якой у гэтым была зацікаўлена дзяржава. Але пачынаць давялося ў складаных умовах: пры адсутнасці развітых культурнага асяроддзя, сацыякультурнай сферы, ва ўмовах малапісьменнасці, непісьменнасці і — самае галоўнае — адсутнасці кадраў, здольных выканаць сацыяльны заказ дзяржавы. Бясспрэчна, названыя акалічнасці адмоўна адбіліся на змесце і рэалізацыі культурных планаў, што не падняліся вышэй за першы ўзровень — ліквідацыі агульнага і палітычнага невуцтва. Тым самым вясковае насельніцтва ў сваёй большасці не ўдавалася далучыць да здабыткаў сусветнай культуры, агульначалавечых каштоўнасцей. Можна пагадзіцца: поўны кантроль партыі, дзяржавы над культурай, празмерная яе ідэалагізацыя не садзейнічалі распаўсюджванню нацыянальнай культуры, развіццю свядомасці сялянства.

Аснову афіцыйнай палітыкі фарміравалі ідэі сацыяльных роўнасці і справядлівасці, прызнання працоўных самым



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дастойным класам, негатыўных адносін да буржуазіі, інтэлігенцыі і інш. Яны сталі зместам новай культуры, на аснове якой вялася афіцыйная прапаганда нейкага ідэальнага свету, свайго кшталту сацыяльнай утопіі, накіраванай у будучыню. Людзі прывучаліся да перажывання за сусветную рэвалюцыю, лёс яе змагароў, іх прымушалі аказваць апошнім матэрыяльную падтрымку праз шматлікія грамадскія арганізацыі. Такая прапаганда падмяняла спрадвечныя пачуцці міласэрнасці, суперажывання блізкім, адлучала ад сямейных і народных традыцый.

Безумоўна, пры вывучэнні праблем культурнага свету нельга ігнараваць цеснай сувязі культуры з грамадскім жыццём, абыходзіць умовы яе сацыяльнага функцыянавання. Узаемадзеянне і ўзаемапранікненне сацыяльных і культурных сфер з'яўляецца найбольш важнай характарыстыкай стану духоўнага жыцця грамадства. Аднак дасягненні грамадскіх навук, новыя метадалагічныя падыходы ствараюць магчымасць пераасэнсавання сацыякультурнага развіцця тагачаснага грамадства, асабліва вясковага.

Гэта дазваляе паглыбіць культуралагічную адукацыю, наблізіць яе да дзяржаўных стандартаў.

**Ф.П.Герладжы, Р.І.Дзвінка,** *дацэнты*

## ДЕЯКІ АСПЕКТИ ОРГАНІЗАЦІЇ НАВЧАЛЬНОЇ ДІЯЛЬНОСТІ СТУДЕНТІВ
### (в Рівненськім державнім інституті культури)

Сучасна соціокультурна ситуація характеризується переорієнтацією практики пасивного споживання інформації і культурних цінностей на активну участь людей у розвитку їх самодіяльных засад, перетворенням культурно-освітніх установ в інформаційно-дозвільні центри задоволення найрізноманітніших соціально-культурних потреб та



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ